# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Беларускі Дзяржаўны Універсітэт 1921

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 8 лютага 2001 года, чацвер, № 2 (1831)


**ПОСТФАКТУМ**

## ДЗЕНЬ НАВУКІ ПРАВОДЗІЎСЯ Ў БДУ

24 студзеня 2001 года ў актавай зале Беларускага дзяржаўнага універсітэта прайшоў Дзень беларускай навукі. Падчас навуковай сесіі былі заслуханы даклады на такія тэмы, як "Стан і перспектывы развіцця энергетыкі ў нашай рэспубліцы", "Стан і перспектывы інавацый у галіне хіміі ў рамках класічнага універсітэта", "Навуковыя кадры вышэйшай кваліфікацыі — важнейшы фактар сацыяльна-эканамічнага развіцця". Адкрыў рэспубліканскі сход навуковай грамадскасці намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь М.І. Дзямчук. У Дзень навукі ў нашым універсітэце была наладжана выстава дасягненняў навукова-інавацыйнай дзейнасці ў Беларусі. Закончылася праграма святочным канцэртам.

*Вольга АНІНА*
*Фотаздымкі Генадзя КРАСКОЎСКАГА*









**ВЕДАЙ НАШЫХ!**

## КАМАНДА БДУ Ў ПРЫЗЁРАХ

На традыцыйнай лыжні, якая была наладжана ў мінулыя выхадныя ў Раўбічах, у эстафеце каманда БДУ заняла трэцяе месца, прапусціўшы наперад каманду Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і каманду Мінгарвыканкама.

У склад каманды Белдзяржуніверсітэта ўваходзілі рэктар прафесар А.У. Казулін, першы прарэктар прафесар А.І. Жук, асістэнт факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі М. Лыскоў, выкладчыца кафедры фізвыхавання і спорту БДУ Л.А. Капылова, студэнтка I курса геаграфічнага факультэта Д. Сідарава.

Акрамя таго, студэнты БДУ прымалі ўдзел у іншых забегах — на 5 і на 10 кіламетраў, дзе таксама выступілі вельмі ўдала.

*Вольга СЫРЫЧ*

## УСТАНОВА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА "НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ФІЗІКА-ХІМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ"

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

вядучага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі свабодна-радыкальных працэсаў;

старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі свабодна-радыкальных працэсаў;

навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі свабодна-радыкальных працэсаў;

навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі кандэнсаваных асяроддзяў;

малодшага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі каштоўных металаў;

малодшага навуковага супрацоўніка лабараторыі структурна-хімічнага мадыфікавання палімераў.

*Тэрмін падачы дакументаў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Дакументы прымаюцца па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, аддзел кадраў НДІ ФХП БДУ.*

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

**загадчыкаў кафедраў:** метадаў аптымальнага кіравання, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, крыміналістыкі;

**прафесара кафедры** сацыялогіі;

**дацэнтаў кафедраў:** тэарэтычнай фізікі, ядзернай фізікі, фізікі паўправаднікоў, матэматычнага мадэліравання і аналізу даных, вышэйшай матэматыкі, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў, тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі, біяхіміі, неарганічнай хіміі, аналітычнай хіміі, вышэйшай алгебры, тэорыі функцый, лікавых метадаў і праграміравання, беларускай літаратуры XX стагоддзя, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, рускай мовы, гісторыі беларускай мовы, рускай літаратуры, гісторыі новага і найноўшага часу, міжнародных адносін, міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, раманскіх моў, фізічнага выхавання і спорту, эканамічнай геаграфіі замежных краін, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі;

**выкладчыкаў кафедраў:** англійскай мовы, міжнароднага турызму, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, фізічнага выхавання і спорту, дынамічнай геалогіі;

**старшых выкладчыкаў кафедраў:** квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, тэорыі літаратуры, сацыялогіі, англійскай мовы, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, раманскіх моў, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, фізічнага выхавання і спорту;

**выкладчыкаў кафедраў:** англійскай мовы, міжнароднага турызму, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, фізічнага выхавання і спорту, дынамічнай геалогіі, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі;

**асістэнтаў кафедраў:** батанікі, фізічнай электронікі.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, Белдзяржуніверсітэт, упраўленне кадраў, тэл. 226-59-39.*



# ПРАБЛЕМЫ ГІСТАРЫЧНАГА ПАЗНАННЯ

1—2 лютага гэтага года на гістарычным факультэце БДУ прайшла міжнародная канферэнцыя "Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы гістарычнага пазнання".

Ініцыятарамі правядзення форуму былі Беларускі дзяржаўны універсітэт, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы пры БДУ, Беларуская асацыяцыя "Гісторыя і камп'ютэр" і Беларуская псіхалагічная асацыяцыя.

Упершыню сабраліся разам гісторыкі, філосафы, сацыёлагі, псіхолагі, філолагі, матэматыкі і інфарматыкі з Беларусі, Расіі, Украіны і мноства іншых краін.

У сваіх выступах навукоўцы разглядалі такі вялікі накірунак у тэорыі гістарычнай навукі, як трансфармацыі яе ў бок антрапалогіі і міждысцыплінарнасці. Закраналіся таксама адносна новыя для беларускай навукі тэмы дэмаграфічнай гісторыі, гісторыі паўсядзённасці, псіхагісторыі, гендэрнай гісторыі, вуснай і экалагічнай гісторыі. Навукоўцы падзяліліся вопытам камп'ютэрызацыі гістарычнай адукацыі ў краінах СНД.

Па выніках канферэнцыі быў наладжаны круглы стол на тэму "Класіфікацыя метадаў даследавання і навучання гісторыі".

*Юлія ПІМЕНАВА,*
*супрацоўнік прэс-службы БДУ*



# ПРЫЗЫ ЛЕДЗЬ ДАВЕЗЛІ. СТАМІЛІСЯ...

Напрыканцы мінулага года прайшоў конкурс сярод апаратыўных маладзёжных атрадаў дружыннікаў (АМАД) на базе 120-й мотастралковай дывізіі. Арганізатарам мерапрыемства выступіў Мінгарвыканкам.

У конкурсе прымалі ўдзел каманды АМАДаў ад кожнага раёна сталіцы. Цэнтральны раён Мінска быў прадстаўлены оператрадам інтэрната № 4 БДУ.

Конкурс пачаўся а 8 гадзіне раніцы і зацягнуўся да 16 гадзінаў. Мабыць, халоднае надвор'е спалохала балельшчыкаў: іх амаль не было. Таму баявы дух удзельнікаў падтрымлівала толькі "салдацкая" каша.

Каманда з 10 чалавек (2 першакурснікі і 8 трэцякурснікаў) у гэты дзень старалася выглядаць годна. Змагацца нашай камандзе было цяжэй за іншых, бо ў ёй не было запасных ігракоў. Аднак нашыя хлопцы ад самага пачатку настроіліся на перамогу і таму дзейнічалі арганізавана і згуртавана. У гэтым ім дапамагаў вечаровы камендант інтэрната № 4 БДУ Д. Любкін.

Майстэрства і ўмельства ўдзельнікаў вызначалася ў конкурсах: страявая падрыхтоўка, паласа перашкодаў, стральба, гіры, перацягванне каната. Наш оператрад заняў першае месца па трох першых намінацыях, а за чацвёртае заданне хлопцы атрымалі 3-е месца.

Такое мерапрыемства праводзілася ў Мінску упершыню. Кажуць, нібы першы блін — камяком. Такая ж доля напаткала і конкурс: шмат было недарэчнасцяў. Аднак праўда перамагла — оператрад інтэрната № 4 БДУ заняў першае месца. Прызы (крышталёвую вазу і 2 дыпломы 1-й ступені) ледзь давезлі дадому — стаміліся...

*Алена ЧЫЖ,*
*Марына БАРАНАВА,*
*члены інфармацыйнай камісіі інтэрната № 4*

# НЕ АД УНІВЕРСІТЭТА, А ДЛЯ УНІВЕРСІТЭТА

Міжнародная грамадская арганізацыя «Міжнароднае аб'яднанне сяброў Беларускага дзяржаўнага універсітэта", зарэгістраваная ў жніўні мінулага года, ужо пачала актыўна працаваць на аўтарытэт нашага універсітэта.

У гэтым годзе МАС збіраецца правесці Міжнародную канферэнцыю, прымеркаваную да 80-годдзя БДУ, з удзелам выпускнікоў універсітэта, якія сталі вядомымі дзяржаўнымі і палітычнымі дзеячамі не толькі ў нашай краіне, але і па-за яе межамі.

І гэта натуральна. Калі Кембрыджскі універсітэт сёння ганарыцца сваімі шматлікімі нобелеўскімі лаўрэатамі, то чаму б нам не знайсці сваіх герояў? Апошнія ж знаходзяцца самі, па ўласным жаданні. Вось што напісаў у сваім лісце, дасланым нядаўна ў Мінск, адзін з выпускнікоў БДУ, старшыня парламента Малдовы Думітру Дзьякаў: "Мне блізкая і зразумелая ідэя адкрыцця ў Малдове аддзялення арганізацыі. Я лічу сябе адным з членаў гэтай арганізацыі. Я вітаю пачынанні і пастараюся дапамагчы лідэрам у дасягненні іх мэты".

Міністэрства адукацыі Расійскай Федэрацыі стварыла спецыяльны сайт у Інтэрнэце www.almamater.edu.ru, які дае магчымасць яго выпускнікам заявіць аб сабе, на якім бы канцы свету яны ні знаходзіліся. МАС жа пайшло крыху іншым шляхам. І цяпер актыўна стварае электронную базу даных замежных выпускнікоў, каб мець магчымасць накіроўваць гэтым людзям паведамленні, што пра іх памятаюць і могуць прапанаваць рэальныя сумесныя праекты.

Па словах кіраўніка новай арганізацыі Барыса Уладзіміравіча Малашэнкі, сябар Беларускага дзяржаўнага універсітэта — гэта чалавек, які не толькі добра ставіцца да нашай навучальнай установы, але і можа нешта рэальнае для яе зрабіць. Таму членам МАС можа стаць кожны чалавек, нават той, хто не заканчваў БДУ.

Зразумела, карысць ад супрацоўніцтва можа быць узаемнай. Кожны бізнесмен пагодзіцца ўкласці грошы ў цікавы праект ці праграму. Фінансавыя фонды МАС і будуць утварацца за кошт узгаданых узносаў, а таксама дабрачынных ахвяраванняў і іншых паступленняў.

Барыс Уладзіміравіч Малашэнка не спыняецца нагадваць, што мэта арганізацыі "Міжнароднае аб'яднанне сяброў БДУ" не ўзяць ад універсітэта, а даць яму (у выглядзе навуковых абменаў, стажыровак і г.д.). І адна з задач МАС — стварыць альтэрнатыўную крыніцу фінансавання, каб увасобіць у жыццё новыя пачынанні без матэрыяльнай дапамогі універсітэта.

Пакуль адпаведныя фонды "Сяброў БДУ" толькі ў стадыі станаўлення. І сродкаў, якіх хацелася б для таго, каб разгарнуцца, няма. Але МАС не чакае лепшых часоў і ўжо сёння праводзіць канкрэтную работу. Напрыклад, ён мае магчымасць стварыць "Інтэрнэт-клас". Ужо існуе дамоўленасць з пэўнымі фірмамі пра пастаўку камп'ютэрнага абсталявання. Пытанне толькі ў памяшканні. Праўда, адно памяшканне ўжо выдзелена ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы. Аднак хацелася б, каб студэнты і выкладчыкі маглі працаваць у Інтэрнэце і ў галоўным корпусе універсітэта. Будзем спадзявацца, што гэта толькі справа часу.

Арганізатары "Інтэрнэт-класа" спадзяюцца такім чынам знайсці сродкі для выдачы стыпендый недзе 15-20 студэнтам ад імя "Сяброў БДУ".

Патрабуе рэалізацыі і ідэя адкрыцця кафэ хуткага харчавання, якое дало б магчымасць студэнтам і супрацоўнікам абедаць танна і без асаблівых страт у часе.

Аднак трэба мець на ўвазе, што МАС — арганізацыя міжнароднага маштабу і яе дзейнасць пераважна будзе скіравана на ўдзел у міжнародных праектах і праграмах. Аб гэтым праінфармаваны замежны дыпламатычны корпус, акрэдытаваны ў Беларусі, дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы за мяжой.

З гэтай жа мэтай вось ужо некалькі месяцаў ствараюцца арганізацыйныя структуры і філіялы ў іншых краінах. Юрыдычна такія аддзяленні ўжо аформлены ў Расіі, Вялікабрытаніі, Югаславіі, а таксама ў Беларусі (у Віцебску). Прынцыповыя дамоўленасці аб іх адкрыцці існуюць з Кіпрам, Італіяй, Іспаніяй, Францыяй, Канарскімі астравамі, ЗША, Канадай. Вядзецца праца для таго, каб яны з'явіліся ў Ізраілі, Кітаі, Іарданіі, Гане, Лівіі, Японіі, Польшчы, Балгарыі, Германіі. Яны будуць папулярызаваць БДУ ў гэтых краінах, а таксама аказваць нам інфармацыйную падтрымку, прыцягваць студэнтаў на вучобу, ладзіць навуковыя абмены.

МАС зацікаўлена, каб не толькі нашы студэнты і выкладчыкі выязджалі за мяжу, але і каб у БДУ навучаліся людзі з розных краін. Пакуль жа ў нашым універсітэце сярод замежнікаў пераважаюць кітайскія студэнты. Новая арганізацыя сёння ў стане прафінансаваць паездку выкладчыка ў любую краіну для таго, каб ён мог расказаць пра універсітэт і падабраць маладых людзей, якія хочуць і могуць вучыцца ў яго сценах. Распрацоўваецца магчымасць фарміравання груп будучых замежных студэнтаў у Перу, Калумбіі, на Кіпры, у Расіі. Кітайскія студэнты таксама не застаюцца абдзеленымі ўвагай. Па дамоўленасці з дырэкцыяй дэпартаменцкай консульскай службы МЗС Расійскай Федэрацыі "Сябры БДУ" арганізавалі ім калектыўныя транзітныя візы. Дапамаглі яны з візамі і Студэнцкаму саюзу БДУ, які нядаўна накіроўваў нашых студэнтаў у Вільнюскі універсітэт у рамках дагавора аб партнёрскіх адносінах.

Наогул, наладжванне патрэбных сувязей — вельмі карысная рэч, хоць і працаёмістая.

Міжнароднае аб'яднанне сяброў БДУ накіравала спецыяльную заяву ў ЮНЕСКА, каб атрымаць пэўны статус. Справа ў тым, што ўсталяванне адносін з ЮНЕСКА дазваляе рэалізоўваць міжнародныя праграмы і такім чынам мець прэферэнцыі для БДУ.

"Сябры БДУ" імкнуцца ўсталяваць сувязь з усімі міжнароднымі недзяржаўнымі арганізацыямі і вядуць з імі перапіску. Напрыклад, яны ўжо дамовіліся з кафедрай ЮНЕСКА Дзяржаўнага універсітэта кіравання ў Маскве аб адкрыцці яе аддзялення на базе сваёй арганізацыі.

На сённяшні дзень МАС падрыхтавала заяўку на ўдзел у праекце па лініі УВКБ ААН. Ён датычыцца аказання дапамогі асобам, якія знаходзяцца на падрыхтоўчых факультэтах у нашай рэспубліцы і вывучаюць рускую мову. Калі яна будзе задаволена, то з'явіцца яшчэ адна магчымасць — накіраваць беларускіх дзяцей у Акадэмію мастацтваў у Санкт-Пецярбурзе.

"Сябры БДУ" спрабуюць рэалізаваць і адзін з праектаў па лініі ТАСІС, каб наладзіць належныя ўзаемаадносіны са сваімі філіяламі ў іншых краінах. Шукаюцца шляхі, каб нашы студэнты змаглі папрацаваць або адпачыць за мяжой гэтым летам і г.д.

Карацей кажучы, ідзе карпатлівая паўсядзённая работа. І першыя яе вынікі будуць падведзены на міжнароднай канферэнцыі, якую збіраюцца правесці ў кастрычніку і прымеркаваць да 80-годдзя БДУ. Падчас яе мы даведаемся і пра далейшыя планы новай арганізацыі, якая створана для універсітэта, хоць і не з'яўляецца яго структурным падраздзяленнем. Магчыма, тады мы на свае вочы ўбачым і першых сяброў БДУ.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*

***Ад рэдакцыі:*** *членам Міжнароднай грамадскай арганізацыі "Міжнароднае аб'яднанне сяброў БДУ" можа стаць кожны, хто разумее, што не толькі здолее рэалізаваць свае магчымасці праз гэтую арганізацыю, але прынясе універсітэту нейкую карысць, і не абавязкова матэрыяльную. Трэба толькі набраць нумары 209-53-12, 206-61-73, 209-53-50, 209-53-51, і на ўсе пытанні адкажа кіраўнік арганізацыі Барыс Уладзіміравіч Малашэнка.*

# Спявайце пад грукат цягніка!

*Наша газета ўжо згадвала (№ 17 за 21 снежня 2000 года), што ў снежні ў студгарадку прайшоў фестываль аўтарскай песні "Срэбраныя струны". Гэтае ўжо традыцыйнае мерапрыемства праводзіцца штогод пры падтрымцы Апякунскага савета БДУ. Сёлета пераможцам конкурсу стаў Яўген Сілівонец – студэнт І курса факультэта міжнародных адносін БДУ. Адразу пасля гала-канцэрта гэты абаяльны малады чалавек пагадзіўся даць інтэрв'ю для чытачоў "Беларускага універсітэта".*



*— Яўген, ты вучышся на першым курсе самага, мабыць, прэстыжнага факультэта БДУ. Скажы, не страшна было табе, хлопцу з невялікага райцэнтра — Петрыкава, "штурмаваць" такую спецыяльнасць, як "міжнародны турызм"?*

— Зусім не. Перад гэтым я два гады навучаўся ў ліцэі ў Гомелі. Гэты ліцэй мне даў вельмі шмат: там былі свае сесіі, іспыты, калёквіумы... Таму тут было вельмі проста... Ну не тое, каб проста, але я быў упэўнены ў сваіх сілах.

*— Адзін твой сябар распавядаў мне, як ты спяваў у сваім двары ў Петрыкаве. Нібыта, твой голас было чуваць нават пры зачыненым акне, і пры першых словах песні ён выключаў тэлевізар, сядаў каля акна і слухаў цябе.*

— Я заўсёды спяваю дома, у Петрыкаве. Наогул, спяваць — маё прызванне. Я распавяду гісторыю, як я голас развіў (таксама з ліцэем звязана). Я пастаянна ездзіў на цягніках у Гомель і дадому. І гітара, вядома ж, заўжды была са мной. У такіх умовах спяваць трэба было так, каб не цягнік было чуваць, а цябе. Даводзілася гарлаць ва ўсю моц, таму паступова за два з паловай гады ў мяне развіўся голас. Таму, сапраўды, калі я спяваю, мабыць, чуваць далёка.

*— Яўген, а дзе табе больш прыемна спяваць: на сцэне, як зараз, ці ў двары, у сяброўскай кампаніі, з дзяўчатамі, пад піва?..*

— Пад піва, з дзяўчатамі. Разумееш, там розныя песні, розны рэпертуар. І ўсё ж пад піва, з дзяўчатамі я даўно ўжо не спяваю: у мяне ёсць свая кампанія, дзе мы проста любім слухаць гітару.

*— Іначай кажучы, табе больш прыемна спяваць у кампаніі?*

— Так, вядома, мне прыемна "заводзіць" публіку сваімі спевамі. Але ў сваёй кампаніі, у больш шчыльным коле, я магу спяваць песні, якія мне больш падабаюцца, якія я люблю. А людзі ў зале могуць проста не пачуць, не зразумець іх са сцэны. Таму мне больш падабаецца граць у кампаніі.

*— Тут, на конкурсе, ты мог ацаніць сваіх сапернікаў. На тваю думку, хто тут быў сапраўды таленавітым, неардынарным?*

— Вядома, таленавітыя людзі былі. Вось мой зямляк, Алесь Герасіменка (інтэрнат № 10), ён спяваў па-беларуску. Я яго поўнасцю падтрымліваю. Пісаць песні па-беларуску ў наш час можа не кожны, і, на маю думку, гэта трэба падтрымліваць. Я за яго вельмі хваляваўся. Гэта быў варты сапернік у плане аўтарства. Што датычыць тэхнікі, тут на мяне зрабіў уражанне дуэт Дзяніса Сарканс-Лонскіса і Сяргея Мароза (інтэрнат № 2). Яны па праве занялі першае месца.

*— Ты зараз пахваліў Алеся. А сам спрабаваў калі-небудзь спяваць, сачыняць песні па-беларуску ці нават на замежнай мове (усё ж такі навучаешся на ФМА)?*

— Вядома. Да гэтага я навучаўся ў англійскім класе, а там даводзілася спяваць на мове, якую вывучаеш. А наогул я люблю спяваць па-італьянску.

*— Ты ведаеш італьянскую?*

— Ведаю. Прынамсі, размоўную. А наконт беларускай... Беларуская эстрада ў параўнанні нават з расійскай і ўкраінскай знаходзіцца крыху "ў занядбадзе". Так, мне падабаецца спяваць па-беларуску народныя песні. Але калі я пачну спяваць іх са сцэны, мяне хутчэй за ўсё не зразумеюць. А калі і зразумеюць, мне трэба будзе ісці ў хор. Гітара — гэта крыху іншае.

*— А якая музыка табе падабаецца?*

— Зусім розныя напрамкі. Калі быць больш канкрэтным — гэта не папса, вось і ўсё. Спярша быў "стары добры савецкі рок", як яго сёння называюць: "Кіно" "ДДТ", магчыма — "Калінаў мост". Рок, рок-н-рол... Зараз больш слухаю "металічную" музыку, бо яна больш прафесійная.

*— Нясціплае пытанне: ты спяваеш сваёй дзяўчыне?*

— Дзяўчына? Я зараз знаходжуся ў творчым пошуку... А да гэтага спяваў італьянскія серэнады.

*— Рамантычна, нават вельмі — серэнады пад акном...*

— І не толькі пад акном. Рамантычна — я гэта вельмі люблю.

*— Што ж, я шчыра жадаю табе знайсці сваё каханне. І, вядома ж, спяваць, працягваць удзельнічаць у конкурсах і абавязкова перамагаць.*

— Дзякуй!

*Адэліна ПАПОВА*

*Фотаздымкі Генадзя КРАСКОЎСКАГА*



## ПАСМІХНЕМСЯ!

***

У аўтобусе, трымаючыся за парэнчы, стаіць студэнт, а на ягонай руцэ вісіць дзіўны плашч. Побач сядзіць бабка і спачувальна кажа:

— Бедненькі! Зусім сіні! А худы які!.. Мабыць, выдатнік?

— Не, бабуля, я на "добра" вучуся. А вось Іваноў, — паказвае на "плашч", — вось ён выдатнік...

***

У прыбіральні ВНУ. Голас з першай кабінкі:

— Табе прафесар залік паставіў?

— Не, не паставіў, сабака! — голас з другой кабінкі.

Голас з трэцяй:

— І не пастаўлю!

***

Хірург — студэнту-практыканту:

— Я ведаю, стары, што гэта твая першая аперацыя. Ты, канешне ж, хвалюешся. Але я цябе вельмі прашу: калі ўскрываеш хворага, не націскай на скальпель вельмі моцна — можаш падрапаць стол.

# ВЫНІКІ АЛІМПІЙСКАГА ГОДА

*Кафедра фізічнага выхавання і спартыўны клуб нашага універсітэта, сабраўшы на спартыўны вечар лепшых спартсменаў, выкладчыкаў і актывістаў, падвялі вынікі сезона мінулага 2000 года. У спартыўных адносінах гэты год быў незвычайным – алімпійскім.*

## Міжнародныя спаборніцтвы

Пяць нашых студэнтаў-спартсменаў у складзе Нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь прынялі ўдзел у Алімпійскіх гульнях у Сіднеі.

Найбольшы поспех чакаў майстра спорту міжнароднага класа (МСМК) першакурсніцу факультэта міжнародных адносін Ганну Глазкову — срэбраны медаль у групавых практыкаваннях па спартыўнай гімнастыцы.

Астатнія нашыя алімпійцы — заслужаны майстар спорту Сяргей Ліштван, майстар спорту міжнароднага класа Віталь Жук (грэка-рымская барацьба), лёгкаатлеты МСМК Наталля Сафронава і Андрэй Міхневіч (усе — навучэнцы юрфака) — засталіся, на жаль, без медалёў.

Добрых вынікаў дабіліся ў 2000 годзе і іншыя нашыя спартсмены.

Сярод іх юрысты Аляксандр Чахоўскі (другое месца на чэмпіянаце Еўропы сярод студэнтаў) і МСМК Сяргей Жардзецкі — абодва займаюцца грэка-рымскай барацьбой.

Дзюдаісты Сяргей Ждан (гістфак) і Сяргей Шундзікаў (юрфак) на першынстве свету сярод студэнтаў занялі адпаведна другое і трэцяе месцы.

У гіравым спорце вызначыўся Аляксандр Воўк (юрфак) — чэмпіён свету і Беларусі, а таксама Алег Сагадзін (гістфак) — бронзавы прызёр першынства свету і чэмпіён Беларусі.

Шостае месца на першынстве свету па шахматах заняла Паліна Чурун (ФМА).

Надзея Астапук (гістфак) стала чэмпіёнкай Беларусі па лёгкай атлетыцы.

## Лепшыя спартсмены і трэнер-выкладчык БДУ ў 2000 годзе

Наталля Сафронава (III курс юрыдычнага факультэта) — МСМК па лёгкай атлетыцы, чэмпіёнка і рэкардсменка Беларусі, удзельніца Алімпійскіх гульняў.

Віталь Жук (V курс юрыдычнага факультэта) — МСМК, чэмпіён свету, прызёр першынства Еўропы, удзельнік Алімпійскіх гульняў, чэмпіён Беларусі па грэка-рымскай барацьбе.

Віктар Аляксандравіч Рудзянкоў — Заслужаны трэнер СССР і Беларусі, дацэнт кафедры фізічнага выхавання і спорту.

У 2000 годзе ў БДУ было падрыхтавана 7 майстроў спорту міжнароднага класа, 9 майстроў спорту і 110 кандыдатаў у майстры спорту і спартсменаў першага разраду.

## Рэспубліканскія студэнцкія гульні

На гэтых гульнях БДУ выступае ў другой групе, дзе аб'ядныя ВНУ, што не маюць уласных факультэтаў фізічнага выхавання і спорту.

Па выніках 2000 года прызавыя месцы былі размеркаваныя наступным чынам:

Беларуская дзяржаўная політэхнічная акадэмія (спартсмены выступілі ў 16 відах) — 3053 ачкі;

Беларускі дзяржаўны універсітэт (14 відаў) — 2488 ачкоў;

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт (12 відаў) — 1595 ачкоў.

Найбольш важкі ўклад у нашую спартыўную скарбонку ўнеслі зборныя па лёгкай атлетыцы (зімні чэмпіянат — 518 ачкоў, летні — 467), па гіравым спорце і армрэстлінгу (адпаведна — 280 і 140 ачкоў), па шахматах (200 ачкоў), па спартыўным арыентаванні і грэка-рымскай барацьбе (адпаведна — 195 і 192 ачкі).

## Спартакіяда мінулага года: падвядзенне вынікаў

Восем месяцаў доўжыўся спартакіядны марафон 1999/2000 навучальнага года.

Выніковая табліца Спартакіяды факультэтаў нашага універсітэта выглядае наступным чынам:

1 — юрфак (480 ачкоў),
2 — факультэт радыёфізікі і электронікі (390 ачкоў),
3 — ФПМІ (386 ачкоў),
4 — мехмат (368 ачкоў),
5 — геафак (334 ачкі),
6 — ФМА (315 ачкоў),
7 — фізфак (307 ачкоў),
8 — хімфак (272 ачкі),
9 — гістфак (250 ачкоў),
10 — журфак (223 ачкі),
11 — філфак (218 ачкоў),
12 — біяфак (208 ачкоў),
13 — ФФСН (206 ачкоў),
14 — эканамфак (144 ачкі).

## Пераможцы сёлетняй Спартакіяды

Прайшлі чарговыя спаборніцтвы ў рамках Спартакіяды Белдзяржуніверсітэта 2000/2001 навучальнага года.

У спаборніцтвах па гіравым спорце месцы былі размеркаваныя наступным чынам:

1 — юрфак,
2 — фізфак,
3 — факультэт радыёфізікі і электронікі,
4 — факультэт кіравання і сацыяльных тэхналогій,
5 — ФПМІ,
6 — гістфак,
7 — біяфак,
8 — геафак,
9 — журфак,
10 — ФФСН.

На спаборніцтвах па армрэстлінгу табліца пераможцаў выглядае так:

1 — фізфак,
2 — юрфак,
3 — факультэт радыёфізікі і электронікі,
4 — геафак,
5 — ФМА,
6 — гістфак,
7 — хімфак,
8 — ФПМІ,
9 — мехмат,
10 — біяфак,
11 — эканамфак,
12 — журфак,
13 — філфак.

Каманды, якія ўдзельнічалі ў спаборніцтвах па міні-футболе, занялі наступныя месцы:

1 — ФПМІ,
2 — геафак,
3 — філфак,
4 — юрфак,
5 — журфак,
6 — гістфак,
7 — фізфак,
8 — факультэт радыёфізікі і электронікі,
9 — мехмат,
10 — ФМА,
11 — хімфак,
12 — эканамфак,
13 — біяфак,
14 — ФФСН.

Спаборніцтвы па бегу вызначылі наступных пераможцаў:

1 — юрфак,
2 — хімфак,
3 — мехмат,
4 — факультэт радыёфізікі і электронікі,
5 — ФПМІ,
6 — геафак,
7 — эканамфак,
8 — біяфак,
9 — фізфак,
10 — гістфак,
11 — ФФСН,
12 — журфак,
13 — філфак,
14 — ФМА.

У мужчынскіх спаборніцтвах па валейболе месцы былі размеркаваныя наступным чынам:

1 — юрфак,
2 — ФПМІ,
3 — ФМА,
4 — мехмат,
5 — факультэт радыёфізікі і электронікі,
6 — гістфак,
7 — геафак,
8 — хімфак,
9 — фізфак.

*Надзея БАЛДЗІНА*

# СПАРТАКІЯДА ВЫЯВІЦЬ МАЦНЕЙШЫХ

На пачатку лютага пачаўся другі тур Спартакіяды студэнцкага гарадка Белдзяржуніверсітэта. Кожны інтэрнат павінен выставіць сваю каманду для ўдзелу ў спаборніцтвах па пэўным відзе спорту. У найбліжэйшы час пройдуць спаборніцтвы па наступных відах:

мініфутбол — у лютым (гэта новы від спаборніцтваў, які ў студгарадку праводзіцца ўпершыню);
баскетбол, шахматы — у сакавіку;
настольны тэніс, плаванне — у красавіку;
гіравы спорт — у маі.

*Інфармацыйная служба студгарадка БДУ*

# "Валянцінка": рэбус ці санет?

*Дзень святога Валянціна, нібыта, зусім нядаўна ўвайшоў у нашае жыццё. Аднак за апошнія гады ён так трывала стаў адным з самых улюбёных святаў моладзі, што здаецца, быццам святкавалі яго заўсёды.*



Адмысловых беларускіх традыцыяй святкавання гэтага пакуль што не існуе. Будзем спадзявацца, што гэта — з'ява часовая. А вось у іншых краінах дзень святога Валянціна мае свае даўнія традыцыі.

Напрыклад, у сярэднявечнай Англіі быў распаўсюджаны звычай выбіраць сабе "Валянціну". Некалькі маладых людзей збіраліся разам, пісалі на кавалачках пергаменту імёны дзяўчат, складалі іх у капялюш і цягнулі жэрабя. Тая дзяўчына, імя якой выцягваў хлопец, на цэлы год станавілася ягонай "Валянцінай", а ён — ейным "Валянцінам". Для сваёй дзяўчыны "Валянцін" складаў санеты, граў ёй на лютні, паўсюдна суправаджаў яе — адным словам, паводзіў сябе як сапраўдны рыцар. Менавіта гэты звычай згадвала шэкспіраўская Афелія ў сваёй славутай песні.

Бесклапотныя італьянцы ў дзень святога Валянціна лічаць сваім абавязкам дарыць каханай падарункі (пераважна слодычы). Напэўна, таму ў Італіі гэты дзень і называецца "салодкім".

Галантныя французы першымі ўвялі ў сябе "валянцінкі" — амурныя пасланні-чатырохрадкоўі. (Пра сам звычай дарэння "валянцінак" мы пагаворым крыху ніжэй.)

Спакойныя палякі любяць у гэты дзень наведваць познаньскую мітраполію: там, паводле падання, знаходзяцца мошчы святога Валянціна, а над галоўным прастолам — ягоны абраз. Палякі вераць, што паломніцтва да яго дапамагае ў справах кахання.

Кансерватыўныя немцы ўпарта лічаць Валянціна апекуном псіхічна хворых, упрыгожваюць у гэты дзень усе лякарні пунсовымі стужкамі, а ў каплічках спраўляюць адмысловую імшу.

У Японіі ў гэты дзень адбываецца "самае гучнае любоўнае прызнанне": на памост узбіраюцца юнакі і дзяўчаты і па чарзе крычаць з усяе моцы словы кахання. А найлепшы крыкун атрымлівае прыз.

Словам, канкрэтыка ў кожнай краіне розная. Але не сумнявайцеся, што самым лепшым падарункам для каханага чалавека стануць словы: "Я кахаю цябе!"

Цудоўным дадаткам да гэтых словаў стане паштоўка-"валянцінка" (зрэшты, гэта можа быць не толькі паштоўка, а што заўгодна — галоўнае, каб падарунак меў форму сэрца ці на ім была эмблема сэрца).

Першыя "валянцінкі" з'явіліся яшчэ ў сярэднявеччы, калі закаханыя гаварылі альбо спявалі адзін аднаму словы кахання. Пісьмовыя "валянцінкі" ўзніклі ў XV стагоддзі. Самая старадаўняя з тых, што дайшлі да нашага часу, датуецца 1477 годам — ёй больш за 500 гадоў. Упершыню шырокая публіка пабачыла гэты рарытэт у сакавіку мінулага года на выставе, прысвечанай тысячагоддзю англійскай літаратуры.

У гэтым пасланні дзяўчына просіць юнака даказаць, што ён сапраўды кахае яе. Яна паведамляе, што даможацца, каб маці павялічыла пасаг, а ён абавязаны ажаніцца з ёй, што б ні здарылася.

Гэты ліст быў выкуплены бібліятэкай у брытанскай сям'і, якая захоўвала яго, яшчэ ў 1930-х гадах. Аднак толькі ў 1999 годзе яго знайшоў адзін з супрацоўнікаў бібліятэкі, і толькі летась яе змагла пабачыць шырокая публіка.

Раней папяровымі "валянцінкамі" абменьваліся заміж падарункаў. Асабліва папулярныя яны былі ў Англіі. "Валянцінкі" рабілі з каляровай паперы і надпісвалі каляровым атрамантам.

У нашых продкаў у вынаходлівасці аздаблення "валянцінак" не лішне і павучыцца. Іх дасціпнасць не ведала межаў. Самыя таленавітыя пісалі "валянцінкі" ў выглядзе акравершаў: першыя літары кожнага радка складалі разам імя каханай. "Валянцінкі" выразалі маленькімі нажнічкамі ці праколвалі маленькімі шпількамі ў выглядзе карункаў, фарбавалі праз трафарэт, стваралі "валянцінку"-пазл і "валянцінку"-рэбус і нават імітавалі сярэднявечны рукапіс з каляровымі малюнкамі.

На пачатку XIX стагоддзя пачалася серыйная вытворчасць "валянцінак": першыя малюнкі былі чорна-белымі, намаляванымі ўручную на фабрыцы. Канешне, з сучаснай індустрыяй гэта не параўнаць — у наш час закаханыя могуць павіншаваць адзін аднаго нават віртуальнымі "валянцінкамі".

Асноўны сімвал дня святога Валянціна — сэрца. У ім жывуць каханне і спагада, літасць і гнеў. Сэрца і самы часты сімвал, які ўжываецца для "валянцінак": форму сэрца маюць торты, паштоўкі і нават ...вяхоткі.

Аднак сімвалам гэтага дня можа быць не толькі сэрца. Чырвоная ружа — улюбёная кветка багіні кахання Венеры. Чырвоны колер — колер моцнага пачуцця.

Яшчэ адзін атрыбут (ці сімвал) дня святога Валянціна — карункі. Сотні гадоў жанчыны насілі з сабой карункавыя хустачкі. Калі яна падала ў паненкі, мужчына, які знаходзіўся побач, мусіў падняць хустачку і падаць яе жанчыне. Часам паненка знарок губляла хустачку, каб пазнаёміцца з упадабаным мужчынам. У хуткім часе карункі сталі выклікаць трывалую асацыяцыю з амурнымі прыгодамі (памятаеце сцэну з "Трох мушкецёраў", калі д'Артаньян спрабуе вынуць карункавую хустачку з-пад ног у Араміса?). Менавіта таму ў наш час на дзень святога Валянціна нярэдка для ўпакоўкі падарункаў выкарыстоўваецца папера ў выглядзе карункаў.

Яшчэ адзін сімвал дня святога Валянціна — заручальныя пярсцёнкі. Яшчэ дзве тры стагоддзі таму было

вельмі папулярна арганізоўваць заручыны менавіта ў гэты дзень. Тады ж нявеста і жаніх упершыню абменьваліся пярсцёнкамі.

Напэўна, толькі сэрцу саступаюць паводле папулярнасці ў гэты дзень птушкі. У дзень святога Валянціна вельмі шануюцца галубы — улюбёныя птушкі Венеры: яны ўсё жыццё не мяняюць сваю пару і разам клапоцяцца пра птушанятаў.

Ну, і вядома, што сімвалам гэтага дня кахання з'яўляецца Купідон, ён жа Амур. Сын Венеры вельмі лёгка можа прымусіць чалавека закахацца, калі пацэліць у яго адной са сваіх чароўных стрэл.

Як ужо казалася вышэй, "валянцінка" не абавязкова павінна мець форму сэрца ці чагосьці падобнага. Які-небудзь з сімвалаў гэтага свята можа проста ўпрыгожваць ваш падарунак каханаму чалавеку. Напрыклад, ва Уэльсе раней выразалі драўляныя "лыжкі кахання" і дарылі іх прадмету свайго пачуцця. Лыжкі былі ўпрыгожаныя сардэчкамі, ключамі і замочнымі адтулінамі, што азначала: "Ты знайшоў шлях да майго сэрца".

Шмат хто ў дзень святога Валянціна дорыць сваім каханым розныя прысмакі: прадаюцца нават адмысловыя цукеркі ў выглядзе сэрца.

А ў некаторых краінах незамужнім жанчынам прынята дарыць вопратку. Калі дзяўчына прымае такі падарунак, значыць яна згаджаецца выйсці замуж за гэтага чалавека.

І напрыканцы — некалькі прыкметаў для тых, хто не паспеў пагадаць на Каляды. Існуе павер'е, што калі дзяўчына 14 лютага пабачыць малінаўку — яна выйдзе замуж за матроса, калі вераб'я — за бедняка (але будзе з ім жыць шчасліва), калі шчыгла — за мільянера.

Можна заняцца і самым сапраўдным гаданнем. Задумайце імёны пяці-шасці мужчын (жанчын), сімпатычных вам. Трымаючы яблык за ножку, раскруціце яго і паўтарайце іх імёны. На чым імі ножка адарвецца, той чалавек і стане вашым нарачоным.

*Вольга СЫРЫЧ*

**ТЭСТЫ**

# *Што вы думаеце пра каханне?*



*Вы хочаце вызначыцца ў сваіх поглядах на каханне і параўнаць меркаванні блізкага вам чалавека? Пастаўце побач з прыведзенымі ніжэй сцвярджэннямі "так", "не" ці "?".*

1. Мужчына, на маю думку, павінен заўжды быць больш актыўны, чым жанчына.
2. Я люблю прыносіць радасць каханаму чалавеку нават з нязначнай нагоды.
3. Мне няёмка быць пяшчотным з каханым чалавекам у чужой прысутнасці.
4. Я адчуваю сябе абсалютна неабходным (ай) каханаму чалавеку.
5. Праз 15 гадоў сумеснага жыцця галоўнай становіцца звычка.
6. Мне лёгка выказваць сваё пачуццё і казаць пра яго.
7. Калі б не дзеці, дом, звычкі, я б усё перамяніў (ла) у сваім жыцці.
8. Чалавек, з якім я жыву разам, з'яўляецца для мяне самым блізкім і дарагім.
9. Шчыра кажучы, мне цяжка сказаць, што такое каханне.
10. Тое, што адбываецца паміж мной і блізкім мне чалавекам, вельмі важна і шмат значыць для мяне.
11. Я часцей раўную каханага (ую), чым сумую па ім (ёй).
12. Я вельмі кахаю чалавека, з якім мяне звёў лёс.
13. Часам я стамляюся ад чалавека, з якім жыву.
14. Я часта стараюся парадаваць блізкага мне чалавека.
15. Часам мне падаецца, што зусім не разумеем адзін аднаго і абсалютна па-рознаму ўяўляем наш саюз.

Падлічыце балы: пастаўце сабе па 10 балаў за кожны станоўчы адказ на пункты 2, 4, 6, 8, 10, 12, 14 і кожны адмоўны адказ на пункты 1, 3, 5, 7, 9, 11, 13, 15. За кожны пытальнік пастаўце сабе 5 балаў.

*100—150 балаў.* Вы ўваходзіце ў лік людзей пачуццёвых. Умееце кахаць глыбока і аддана, не саромеецеся свайго кахання і ўмееце выказаць яго. Аднак пры неспрыяльных абставінах вашае каханне можа стаць для вас крыніцай пакутаў, а ўскладненні ва ўзаемаадносінах з блізкім чалавекам — прычынай сапраўднага гора. У вас ёсць усе здольнасці, каб дасканала авалодаць цяжкім мастацтвам кахання, бо вы можаце як кахаць самі, так і выклікаць пачуцці ў адказ.

*50—95 балаў.* Вы чалавек ўражлівы. Пытанне пачуццяў з'яўляецца важным для вас, хаця жыццё і навучыла вас, што не заўжды гэтая праблема павінна стаяць на першым плане. Бывае, што пачуццё можа поўнасцю авалодаць вамі, аднак наўрад ці вам пагражае небяспека згубіць пры гэтым галаву. Рэалізм, цярплівасць, а часам і гонар — вось што кіруе вашымі паводзінамі. Вашая пераменлівасць можа ўспрымацца блізкім вам чалавекам як халоднасць альбо капрыз.

*0—45 балаў.* Вы кіруецеся разважай. Перш чым выявіць якое-небудзь пачуццё, дзесяць разоў усё ўзважыце і абдумаеце. Каханне вас ужо даўно не вабіць. Логіка і развага — вось "апора" вашага жыцця, добразадзейнасць і прадбачлівасць — ваш шлях да шчасця. Чароўнасць рамантычнага кахання — не для вас. Гэта падаецца вам смешнай дзіцячай забаўкай. Але... ці не задавальняецеся вы ўсяго толькі роллю "маўра" ва ўзаемаадносінах з блізкім чалавекам?

**ЯК ЖЫВЕШ, ІНТЭРНАТ?**

# АД БАЯНА ДА ВІЯЛАНЧЭЛІ

Прамінула зімовая сесія з перапоўненымі аўдыторыямі чытальняў у бібліятэках, са шматпакутнымі залікоўкамі. Аднак зіма гэта ж не толькі сесія, гэта яшчэ і мноства святаў: Каляды, Новы год, яшчэ адны Каляды, стары Новы год... І, здаецца, самы час прыгадаць не толькі "усенародныя" святы, але і тыя, што не так ужо даўно радавалі толькі нас.

Гэтак, напрыканцы 2000 года прайшоў адзін, на мой погляд, удалы вечар. Месца для яго правядзення (інтэрнат № 6 БДУ) было абрана не выпадкова: вялікі беласнежны хол нядаўна адрамантаванага інтэрната нібы спецыяльна створаны для падобных мерапрыемстваў.

У холе інтэрната № 6 прайшоў вялікі канцэрт гітарыстаў. Паводле задумы арганізатараў дзеі, гэта быў не зусім традыцыйны сход з фальшыва ажыўленымі выступоўцамі і гледачамі, якія, зручна ўладкаваўшыся ў фатэлях, млява апладзіруюць ім.

Абаяльны вядучы прапанаваў слухачам сядаць проста на падлозе перад сцэнай: праграма абяцала быць насычанай. Напачатку народ перспектывы не ацаніў, імкнучыся туліцца да сценак. Аднак ужо пасля некалькіх песень у імправізаваную глядзельню памкнуліся зацікаўленыя студэнты з коўдрамі і крэсламі.

Музыканты — студэнты і аспіранты БДУ і "сяброўскіх ВНУ" — выходзілі на спецыяльна змайстраваную сцэну ў парадку жывой чаргі. Цікавага было шмат. Разнастайнасць песень (ад аўтарскіх да беларускіх народных і рэпертуару Земфіры), музычных інструментаў (ад баяна да віяланчэлі), выканаўцаў і груп не давала сумаваць публіцы. Дый гледачы паводзілі сябе досыць актыўна: шумна віталі знаёмых, гуртом падпявалі зусім не вядомыя ім песні і нават самі імкнуліся прадэманстраваць сваё майстэрства на сцэне.

Наогул, вечар запомніўся. Хтосьці атрымаў асалоду ад добрай музыкі, нехта — ад чарговай сустрэчы з сябрамі, а камусьці — удалося расслабіцца з адчуваннем святочнага настрою. Да Новага года заставалася зусім крыху...

*Адэлька ПАПОВА*

# Крыло анёла

Вандруючы па каменным царстве музея землязнаўства, нельга абысці ўвагай арыгінальную калекцыю кальцытаў — дзівоснае ўтварэнне прыроды. Калекцыя з'яўляецца гонарам музея. Такой шматлікасці і непаўторнасці камянёў няма ні ў аднаго з іншых мінералаў. Асабліва прывабныя друзы — зросткі крышталёў на агульнай аснове. Гэты камень усім нам добра вядомы: ён складае горныя пароды арганагеннага пахо-



джання, якія ўтвараюцца ў выніку назапашвання арганічных рэштак, так званыя вапнякі. З крышталікаў кальцыту складаюцца каралавыя збудаванні, ракавіны большасці малюскаў. Кальцыт утварае каштоўны камень першага класа — жэмчуг, яго называюць "жывым брыльянтам". У адрозненне ад іншых мінералаў, ён здольны ўтвараць своеасаблівыя мудрагелістыя зросткі крышталёў. Прыкладам могуць быць такія назвы друзаў, як "крыло анёла", "воўчы (ці сабачы) ікол", "папіршпат", "грыбочкі", "грэбень пеўніка" і інш. Гэтыя дзівосы можна ўбачыць у музеі землязнаўства, дзе няцяжка атрымаць і дакладную, найбольш поўную крыніцу звестак, таму што на музейных паліцах гэты камень сустракаецца часта, а некалькі вітрын цалкам прысвечаны яму. Ёсць калекцыя ракавак, каралаў і мармуру. Асаблівы інтарэс выклікаюць найбольш цікавыя ўзоры каль-



цытаў — друзы з Дальнягорскага радовішча Прыморскага края, Азербайджана і Кыргызстана, радовішча Хайдаркан. Яшчэ ёсць узоры кальцытаў з Урала, Егіпта (Луксор), Германіі, Іспаніі, Марока, а таксама Італіі. Вельмі прывабныя кальцыты з Міхайлаўскага радовішча (КМА), якія ўтварыліся разам з залацістым пірытам — "кашэчым золатам".

Пэўна, кожны ведае сталактыты і сталагміты — іх у музеі шмат: яны прывезены з Крыма, Кыргызстана, Казахстана, Краснаярскага края. Утвараюцца яны ў вапняковых пячорах, і той, хто апускаўся ў гэтыя пячоры, абавязкова звяртаў увагу на дробнакрышталічныя вапняковыя масы — "горную муку". Як правіла, у тых жа месцах, дзе ёсць водныя растворы, насычаныя тоненькімі ніткападобнымі крышталікамі вапнякоў, атрымліваецца "горнае малако". У музеі ёсць яшчэ каўказскі кальцыт з экзатычнай назвай "мядовы шпат". Як бачым, у зямных нетрах у царстве кальцытаў сустракаюцца нават такія, якімі можна "паласавацца".

Высока цэніцца ў оптыцы празрыстая разнавіднасць кальцыту — ісландскі шпат. У музей гэты камень трапіў з Ілімскага радовішча Іркуцкай вобласці, з Якуціі і Забайкалля (Слюдзянка і р. Вілюй). Самы буйны крышталь аптычнага кальцыту даўжынёй да 6 метраў здабывалі ў Эксіф'ёрдзе (Ісландыя). Адкрыты ён быў у 1669 годзе: гэты камень знайшлі ў базальтах і палічылі адным з цудаў свету. У гісторыі навукі крышталі саслужылі выдатную службу, таму што дзякуючы ім навукоўцы адразу адзначылі загадкавую з'яву — двупраламленне святла. Праз ісландскі шпат любая рэч бачыцца здвоенай. Зараз гэтая ўласцівасць выкарыстоўваецца ў аптычнай тэхніцы.

Асабліва запамінальны і незвычайны сферакрышталічны ці ружападобны кальцыт, паказаны на здымку. Такія прыгажуны часцей за ўсё сустракаюцца ў Прыморскім краі на Дальнягорскім радовішчы. Сярод кальцытаў вылучаюцца шаўкавістыя разнавіднасці і вельмі прыгожы атласны шпат, яго яшчэ называюць "мармуровым оніксам". У музеі яны таксама ёсць.

Кальцыт прыдатны і ў ювелірнай справе. Адметнай рысай з'яўляецца тое, што ён складае значную колькасць асадкавых парод як хімічнага, так і арганічнага паходжання (вышэй ужо адзначаліся вапнякі, крэйда і інш.), а таксама метамарфічныя (мармур). Гэты мінерал сустракаецца ў прыродзе часта. Па распаўсюджанні ў зямной кары ён займае трэцяе месца пасля палявога шпату і кварцу. Яму належыць унікальная роля ў мінералаўтварэнні карбанатаў: малахіту, арагапіту, азурыту, цэрусіту і інш. Цікавы яшчэ і такі факт: у музеі ёсць малавядомыя страматаліты, якія адкладаліся на дне старажытных вадаёмаў з кембрыйскага перыяду кальцытавых арганічных рэштках, прывезеныя ў музей з Бураціі (узрост парод 500—600 млн. гадоў).



Пры сваёй захапляльнай прыгажосці і цікавасці камень карыстаецца асаблівай павагай, бо ён вельмі патрэбны людзям. Без кальцыю не будуць жыць расліны і жывёлы. Аптычны кальцыт, акрамя названай галіны, выкарыстоўваецца ў радыёэлектроніцы, вылічальных устаноўках, медыцынскай апаратуры, галаграфіі і лазернай тэхніцы. Вапняк з'яўляецца будаўнічым матэрыялам, сыравінай для атрымання цэменту і вапны.

Мармур — прыгожы дэкаратыўны, абліцовачны і скульптурны матэрыял. Гэта адзін з высакародных матэрыялаў, народжаны морам і ўзгадаваны гарачым подыхам планеты, высока ацэнены з глыбокай даўніны — у антычнасці, сярэднявеччы, дый у наш час таксама. Цудоўныя мармуры, якія выпраменьваюць вечную, незямную прыгажосць, часта сустракаюцца і ў нашай сталіцы. Прывезены яны ў Беларусь з Казахстана, Урала, Кыргызстана, Карэліі, Азербайджана, Узбекістана, Сібіры. Сустракаецца і ружовы алтайскі мармур. Амаль на кожнай станцыі метро мы бачым мармур, але ўсё ж самая



прывабная станцыя — "Акадэмія навук". Кожнай яе пліткай можна любавацца бясконца — гэта цудоўны мастацкі твор. Цікавы і той факт, што яны кожнага разу здаюцца нейкімі рознымі: бачацца то пейзажы поўначы, то нейкія касмічныя матывы. Чым не таямніца? Каменнае ўбранства нашага метро вельмі элегантнае. На хвіліначку спыніцеся і павітайцеся з маляўнічым каменем і нізка пакланіцеся каменнай прыгажосці.

*Валянціна СМАЛЯКОВА,*
*геолаг музея землязнаўства БДУ*


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

*Ум. друк. арк. 1*

*Падпісана да друку ў 12.00*

*8 лютага*

*Зак. 46у*

*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45.*

**Рэдактар Т.М. КАЗАК**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка Яўгена Балаша, Вольгі Сырыч*